Сычова І.С. Даследаванне выхаваўчых традыцый беларусаў: пытанні актуалізацыі /Матэрыялы V Міжнародная навукова-практычнай канферэнцыі «Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці. Трансфармацыя традыцыйных каштоўнасцей у інфармацыйным грамадстве» (г. Мінск, 27 верасня 2016г.) – Мінск, ДУА «Інстытут культуры Беларусі». – С. 130-134.

# ДАСЛЕДАВАННЕ ВЫХАВАЎЧЫХ ТРАДЫЦЫЙ БЕЛАРУСАЎ: ПЫТАННІ АКТУАЛІЗАЦЫІ

*Іна Сяргееўна Сычова, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Этнапедагогіка – параўнальна маладая галіна навуковых даследаванняў, станаўленне якой адносіцца да 70-ых гадоў XX стагоддзя, часу расквіту нацыянальных культур народаў СССР. Між тым інфармацыя аб выхаваўчых традыцыях беларусаў, якія бяруць пачатак у глыбокай старажытнасці, ускосна прысутнічае ў працах большасці айчынных фалькларыстаў дарэвалюцыйнага і савецкага перыядаў. Усвядомленая ж навуковая цікавасць праяўляецца найперш у працах А.К. Сержпутоўскага (1864-1940 гг.). Гэта праграма “Элементарнае выхаванне” (раздзелы: 1) задачы выхавання; 2) бацька і маці – галоўныя выхавацелі; 3) дзіця пачынае гаварыць; 4) цацкі, гульні, падарункі, сіла ласкі і любві; 5) пачатак вучобы, адукаванне, настаўнік і настаўніца; 6) адносіны бацькоў і дзяцей у сям’і), кніга “Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў” (раздзелы: “Чараватасць”, “Раджанне”, “Хрысціны”, “Гадоўля дзяцей”, “Гадоўля падшпаркаў і іх жытка”, “Жыццё моладзі” і інш.).

Мэтанакіраваныя этнапедагагічныя даследаванні праводзіліся і ў 20-30-ыя гады XX стагоддзя, калі дзякуючы палітыцы беларусізацыі, будаўніцтву нацыянальнай школы, адбывалася актыўнае станаўленне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў. Але звесткі як пра змест даследаванняў, так і пра імёны навукоўцаў абмежаваныя, што не дазваляе ацаніць іх уклад у развіццё айчыннай этнапедагогікі. Кароткія тэрміны і трагічныя вынікі працэсу беларусізацыі не дазволілі ў поўнай меры ажыццявіць задуманае. Матэрыялы, сабраныя супрацоўнікамі і дабраахвотнымі памочнікамі Інбелкульта ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, верагодна, загінулі ў час Вялікай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Айчыннай вайны або знаходзяцца ў архівах і пакуль не сталі прадметам навуковага вывучэння.

Адметнасць адзначанага перыяду ў тым, што этнаграфічная і краязнаўчая праца стала як ніколі раней масавай, ахапіла ўсю рэспубліку. Пры сельскіх саветах, школах, хатах-чытальнях ствараліся краязнаўчыя таварыствы і гурткі, праводзілася навукова-даследчая работа: збор лексікі, казак, песень, выяўленне помнікаў старажытнасці, вывучэнне хатніх рамёстваў, вуснай народнай творчасці, традыцыйнай харавой, музычнай і драматычнай культуры. Сабраныя матэрыялы дапамагалі наладзіць выхаваўчую работу, наблізіць навучанне, якое ў той час вялося не на аснове прадметнай, а на аснове комплекснай сістэмы навучання, адзінага комплексу "жыццё дзіцяці і акружаючага асяроддзя", да штодзённых інтарэсаў дзяцей, свету прыроды і традыцыйных заняткаў мясцовага насельніцтва.

Так, актыўна дзейнічала Мазырскае Акруговае Таварыства Краязнаўства пад кіраўніцтвам Крукоўскага. У справаздачы за 1928 год, апублікаванай ў часопісе "Наш край", указваецца, што на тэрыторыі Мазырскай акругі (на той час уключала 10 раёнаў: Азарыцкі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Капаткевіцкі, Каралінскі, Лельчыцкі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі і Тураўскі) сабрана 518 запісаў народнай творчасці. Называюцца імёны збіральнікаў, каля 40 чалавек – пераважна настаўнікі, дадзена справаздача па раёнах. Адзначаецца, што Мазырская акруга адзіная, дзе збіральніцкая праца ахапіла ўсе раёны, матэрыялы вызначаюцца якасцю і сістэматычнасцю [5, с. 23-24].

Узгаднялася работа краязнаўчых таварыстваў і органаў адукацыі. У перыядычным друку публікаваліся рэкамендацыі для збіральнікаў. На месцах і ў цэнтры праводзіліся краязнаўчыя канферэнцыі, на якіх пачынаючыя краязнаўцы, у тым ліку вучні, абменьваліся вопытам, атрымлівалі метадычныя рэкамендацыі ад сталых даследчыкаў. У 1927 годзе такая канферэнцыя прайшла пад кіраўніцтвам Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры ў Мінску [4, с. 283].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1923 годзе Наркаматам асветы арганізаваны двухгадовыя "Вышэйшыя курсы беларусазнаўства", на якіх навучэнцы атрымлівалі грунтоўныя веды па гісторыі і геаграфіі Беларусі, беларускай мове і літаратуры, нацыянальна-вызваленчым руху, у тым ліку звесткі з гісторыі этнаграфіі і фальклору, народнай педагогіцы. Падобныя кароткатэрміновыя курсы (на 3, 6 месяцаў, аднагадовыя) дзейнічалі ў Мінску, Слуцку і іншых гарадах [3, с. 79].

Вывучэнню традыцый беларусай народнай педагогікі і ўкараненню іх ў педагагічны працэс у цэлым садзейнічалі наступныя фактары: законы і афіцыйныя дакументы аб арганізацыі школьнай справы; шырокая краязнаўчая работа з удзелам настаўнікаў і вучняў; увядзенне курса "Беларусазнаўства" пры падрыхтоўцы педагогаў; прапаганда народнай творчасці ў педагагічным друку; падрыхтоўка педагагічных кадраў да рэалізацыі народнай педагогікі ў вучэбна-выхаваўчай рабоце школы; распрацоўка комплексных школьных праграм на аснове краязнаўства [4, с. 262]. Гэта мела значны ўплыў на развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

На неабходнасць менавіта этнапедагагічных даследаванняў, як часткі шырокай краязнаўчай дзейнасці, адным з першых звярнуў увагу беларускі этнограф, краязнавец, педагог Мікалай Іванавіч Касяровіч (1900-1937), які з 1921 працаваў інструктарам Наркамасветы БССР, з 1922 інспектарам Слуцкага, з 1924 — Віцебскага аддзелаў народнай асветы. З 1926 навуковым сакратаром Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інбелкульце, сакратаром краязнаўчага часопіса "Наш край" [2].

У артыкуле "Для чаго і як вывучаць быт дзяцей" ён ставіць за мэту сістэматычнае вывучэнне дзіцячага побыту як асобнага аб'екту этнаграфічных краязнаўчых даследаванняў. Аўтар падкрэслівае, што дзіцячы побыт – новая галіна доследаў, таму павінен вывучацца цалкам і ўсебакова па лініі матэрыяльнай і духоўнай культуры з улікам сацыяльных узаемаадносін паміж групамі дзяцей, дзецьмі і дарослымі, а не ў асобных праявах або

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

галінах. Пры гэтым збіральніку важна пасябраваць з дзецьмі, перамагчы іх сарамлівасць, звяртаць увагу не толькі на апісанне дэталяў дзіцячага побыту, але і іх бытаванне, высветляць што пераймаецца і ад каго, як доўга захоўваецца. Весці запісы неабходна стала і сістэматычна на працягу доўгага часу з улікам змен гульняў і заняткаў адпаведна пор года, пажадана з малюнкамі [1].

Даючы парады даследчыкам, М. Касяровіч у духу часу выступае з пазіцый сацыяльна-класавага падыходу, але выказвае меркаванні, цікавыя з пункту гледжання сучаснага стану развіцця этнапедагогікі: аб існаванні дзіцячага побытавага каляндара адпаведна змен пор года і асноўных заняткаў дзяцей; аб вылучэнні ўзроставых груп: 0-3; 3-14; моладзь, дарослыя і старыя; аб складанні слоўніка штодзённай дзіцячай мовы і таемных дзіцячых гаворак; аб адрозненнях побыту, дапаможнай працы, цацак і гульняў дзяцей розных нацыянальнасцей (дзеці цыганоў, палякаў, яўрэяў, татараў, жмудзінаў), дзяцей з сямей прадстаўнікоў розных прафесій (з сямей рыбака, селяніна, гутніка і інш.), розных сацыяльных груп (дзяцей рабочых і сялян, беднякоў і сярэднякоў, кулакоў і нэпманаў) [1, с. 15-16].

М. Касяровіч вылучае наступныя праявы дзіцячага побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры істотныя для апісання і сістэматызацыі:

- дзіцячыя збудаванні і інвентар (будкі, шалашы, дуплы, пячоры, дрэвы, ямы і інш.), якія выкарыстоўваюцца для гульні і як сховішчы ў непагоду пры пасьбе жывёлы;
- адзенне і аздобы, што носяць і робяць сабе дзеці (маскі, упрыгожанні; спосабы аздобы і размалёўвання твару і цела);
- харчаванне і здабыванне яго дзецьмі ў прыродных умовах (ягады, карэнне, лекавыя расліны, бярозавы і кляновы квас і інш.);
- дзіцячае лавецтва (дробных звяроў і птушак), рыбацтва (з прыладамі і без іх) і пчалярства (здабыча мёду дзікіх пчол і вос, разводзене чмялёў);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- побыт і вольны час дзяцей-пастушкоў і падлеткаў, якія займаліся пасьбой гусей свіней, авечак, кароў і коней (прылады працы, спосабы выжывання ў прыродзе, арыентацыі ў прасторы і часе і інш.);
- асаблівасці штодзеннай працы дзяцей (дапамога бацьку і маці па гаспадарцы, догляд малодшых братоў і сясцёр);
- грамадскія ўзаемаадносіны і аб’яднанні дзяцей і падлеткаў (пол і ўзрост, умовы, правілы і формы арганізацыі гульняў і забаў);
- звычаі і абрадавыя гульні дзяцей, іх веды і ўяўленні пра міфалагічных істот, прымхі і забабоны;
- непасрэдна дзіцячая творчасць (самаробныя цацкі, музычныя інструменты і інш.);
- дзіцячы фальклор, гульні, забавы і цацкі, танцы і спартыўныя гульні [1, с. 18-20].

Аўтар адзначае, што падобныя даследаванні маюць вялікае практычнае значэнне: вынікі дапамогуць больш дасканала наладзіць школьнае навучанне і выхаванне, уздзейнічаць на быт сям’і.

Такім чынам, масавая краязнаўчая дзейнасць у 20-30 гады 20 стагоддзя садзейнічала выяўленню традыцый народнага выхавання, выхоўвала свядомых носьбітаў беларускай культуры. У гэты перыяд назапашаны багаты вопыт у галіне краязнаўства і збору матэрыялаў народнай педагогікі, узаемадзеяння школы і мясцовага насельніцтва, устаноў культуры, рэгіянальнага друку, які патрабуе асэнсавання з мэтай выкарыстання найбольш эфектыўных напрацовак у сучаснай сярэдняй і вышэйшай школе, пры арганізацыі выхаваўчай і навукова-даследчай работы з моладдзю.

**Спіс літаратуры і крыніц**

1. Касьпяровіч, М. Для чаго і як вывучаць быт дзяцей / М. Касьпяровіч // Наш край.– 1930. – № 1. – С.15–20.
2. Мікалай Іванавіч Каспяровіч Вікіпедыя. Свабодная энцыклапедыя. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/ – Дата доступу: 2.09.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917-1945) /Г.Р. Сянькевіч, А.В. Трухан, З.М. Ціток [і інш.].; пад рэд. Г.Р.Сянькевіч [і інш.]. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 495 с.
4. Орлова, А.П. Этнопедагогика: учеб. пособие /А.П. Орлова. – Минск: РИВШ, 2014. – 408 с.
5. Шлюбскі Ал. Другі год зьбірання фальклёрнага матэр'ялу /Ал. Шлюбскі // Наш край.– 1928. – № 3. – С.19–27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ